НАШАЕ ЖЫЦЬЦЁ

Цана асобнага нумару 800 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12 п. 6 (Wileńska 12, m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць тры разы у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 9000 м.п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 1000 мк., сярод тэксту 800 мк. і на 4 стрніцы 600 мк. за радок пэтыту ў 1 шпальт.

№ 4 Пятніца 8-га чэрвеня 1923 г. Год I.

На Сэймовым грунце.

Ад самага пачатку істнаваньня сучаснага Сойму ўва ўсіх кутках польскага грамадзянскага жыцьця безупынна йшлі гутаркі аб патребе стварэньня Ураду, які апіраўся-б на польскую большасьць Сойму. Задача была ня лёгкая! Трудна было адшукаць у Сойме такую камбінацыю партый, якая-б дала польскую большасьць.

Дзеля большай яснасьці прывядзем тут склад сучаснага Сойму па партыях.

Эндэкаў—(народ. дэмакр.) —	98
Хадэкаў—(хрысьц. дэмакр.)—	43
Дубадэкаў—(хрысьц. народ.)	24
Каталікоў — — — —	4
Усяго правіцы — —	169
Пястоўцаў — — — —	56
Энпээраў (Народ. Раб. Парт.	18
Усяго цэнтру — —	74
Вызваленцаў — — — —	48
Пэпэасаў (Парт. Польс. Соц.)	41
Група Домбскага (был. Пяст)	14
Оконёўцаў (група кс. Оконя)	4
Група Стапінскага — —	3
Камуністаў — — — —	2
Усяго левіцы — —	115
Усяго палякаў у Сойме —	357
Жыдоў — — — — —	35
Немцаў — — — — —	16
Украінцаў — — — —	20
Беларусаў — — — —	11
Сэрэбранікаў (рускі) — —	1
Панкрац (немец) — — —	1
Хліборобаў (Галіцка-украін. уладоўцаў) — — —	5
Усяго не-палякаў —	89

Такім чынам, як можна бачыць з гэтай схэмы, ні водзін з трох галоўных адламаў Сойму і ні правіца (169), ні цэнтр (74), ні левіца (112),—не складаюць з сябе ні большасьці *усяго Сойму* (444:2), ні нават большасьці *польскіх галасоў* (355:2).

Прымаючы пад увагу тую войструю варожасьць, якую выяўляюць польскія партыі адна да другой, трудна было думаць аб згодзе паміж імі дзеля фармаваньня Ураду абапёртага на *польскай* большасьці.

Тое, што цяпер мы бачым: саюз Пяста (56) з правіцай (169), — зьявішча ненармальнае і, можна думаць, часовае. Трудна дапусьціць, каб сялянін хоць і заможны, ад імя якога выступаюць пястоўцы, мог шчыра пайсьці ў дружбу з абшарнікамі, банкірамі, крайнымі клерыкаламі і г. д. Нам здаецца, што гэты ненармальны саюз ёсьць нічым іншым, як часовым згаворам на адзін мамэнт.

Дзеля якой мэты?

Што-б там ні гаварылі, што цяперашні прэзыдэнт міністраў п. Вітос дасягнуў вялікіх уступак ад эндэкаў па сацыальным пытаньням і што ён будзе праводзіць дэмакратычную праграму, — па ўсяму відаць, што гэтая *пястоўска-эндэцкая згода мае пад сабою не сацыяльны грунт,* а зусім іншы. *Грунт гэта ёсьць—палітычны.* Грунт гэты мае пад сабою шавіністычна-нацыяналістычную падкладку. Да сучаснай згоды новыя саюзьнікі дайшлі, кіруючыся адным: ненавісьцяй да нацыянальных меншасьцяў у Польшчы, жадаючы задушыць усіх не палякаў, якіх вельмі многа ў сучаснай Польшчы. Правіцовыя і цэнтровыя, як Соймовыя, так і наогул польскія кругі праз увесь час істнаваньня сучаснага Сойму ніяк не маглі памірыцца з фактам прысутнасьці ў Сойме досьць салiднага прадстаўніцтва ад нацыянальных меншасьцяў (89). Як у сваіх соймавых прамовах, так і на шпальтах сваіх газэт, правіца і цэнтр пры першай магчымасьці кідаліся ў адчаяную супраць нас атаку.

Ураду Сікорскага, які ў адносінах да нацыянальных меншасьцяў выяўляў скрытую варажасьць і запальчывасьць, правіца і цэнтр пастаянна закідалі дружбу з меншасьцямі, чаго разумеецца, зусім ня было, а было толькі тое, што Сікорскі падвёў прадстаўнікоў нацыянальных меншасьцяў рознымі абяцанкамі, схіліўшы іх галасаваць за свой урад, калі ён толькі што паўстаў. Гэтага не маглі забыць правіцоўцы і цэнтр генаралу Сікорскаму, ня гледзячы на тое, што праз увесь час пасьля нацыянальныя меншасьці яго не падтрымлівалі.

А калі так? Калі нацыянальныя меншасьці трактаваліся правіцай і цэнтрам, як нешта агіднае, да чаго і прыкрануцца ня можна паляку, каб не запэцкацца, дык ці-ж можна цяпер, калі правіца і цэнтр стварылі свой урад, спадзявацца ад іх зьмены адносін? Ці можна ім верыць, што яны здаволяць нашыя „Слушныя“, як сказаў п. Вітос, жаданьні?

Якія жаданьні нашыя урад пана Вітаса прызнае слушнымі, а якія няслушнымі, п. Вітос не сказаў. Адгэтуль можна зрабіць вывад, што п. Вітос будзе сам яшчэ выбіраць і дэцыдаваць аб слушнасьці, або няслушнасьці нашых жаданьняў і, разумеецца, як і папярэднія „дабрадзеі“ будзе толькі „вадзіць за нос“, як вадзілі нас усе іншыя, пачынаючы ад Падэрэўскага і канчаючы Сікорскім.

Н. М.

Палітычныя падзеі.

Польшча. Новы цэнтра-правіцовы ўрад Вітаса насамперш заняўся справамі асадніцтва, з якой мэтай склікаецца спэцыяльная канфэрэнцыя з удзелам прадстаўнікоў ад асаднікаў. Абгаварывацца будзе справа надаваньня на ўласнасьць зямлі для асаднікаў. Урад апрацаваў новую праграму дзейнасьці ў гэтай справе.

Як будзе выглядаць стасунак новага ўраду да свабоды друкаванага слова надта характэрным зьяўляецца канфіската ў Варшаве № 66 радыкальнай газэты „Głos“. Да гэтага часу ў Польшчы канфіскаваліся толькі часопісі нацыянальных меншасьцей ды камуністычныя.

Польская прэса моцна занепакоена выхадам у адстаўку 3 генералаў, якія да гэтага часу беспэрарыву кіравалі ўсімі ваеннымі справамі Польшчы: Пілсудскага, Саснкоўскага і Сікорскага. „Polska Zbrojna“ зьмясьціла з гэтай прычыны абшырны артыкул, у якім даказывае, што фактычна польская армія застаецца цяпер без павадыра і гэта пагражае развалам арміі.

У розных мейсцах Польшчы адбываюцца мітынгі работнікаў і, беззямельных і малазямельных сялян, на якіх вынясены рэзалюцыі пратэста проціў утварэньня ўраду Вітаса—Глонбінскага.

Міністэрства вайсковых спраў выдала загад аб прызыве радзіўшыхся ў 1902 г. і запісі ахвотнікаў радз. у 1903, 1904 і 1905 г. Набор будзе трываць ад 11 чэрвеня да 10 ліпеня г.г.

Літва. Падпісаная паміж Літвою і Нямеччынай гандлёвая умова апіраецца на падставах найбольшага упрывілеяваньня, аднак немцам ня прызнана спэцыяльных канцэсый, якія напр. Літва прызнала Бальтыцкім дзяржавам. Апрача таго загарантаваны свабодны правоз тавараў і ўсялякія пашпартовыя аблягчэньні для грамадзян абодвых дзяржаў. Умова мае сілу на два гады.

Нямеччына. Забурэньні ў Нямеччыне пашыраюцца. У Усходняй Прусіі пашыраецца камуністычны рух. У Кёнігсбэргу дайшла да крывавых боек з паліцыяй. У Лейпцыгу адбыліся вялікія дэманстрацыі безработных, у часе якіх паранена адна асоба. Забастоўкі пашыраюцца па ўсяму абшару. У Бэрліне забаставалі рабочыя электратэхнічных і газавых прадпрыемстваў. У Кёльне забастоўкі трываюць у шэрагу прадпрыемстваў; жалезнадарожнікі пастанавілі далучыцца да забастоўкі. У Вэстфальскім округу таксама ўспакаеньне яшчэ не наступіла, і забастоўка ў мэталургічных прадпрыемствах. У шэрагу мейсцаў дакана на шмат вобыскаў і арыштаў. Забурэньні і забастоўкі вынікаюць з прычын эканамічных, галоўным чынам ад узросту дарагавізны і безрабоцьця.

Англія. Англа-савецкі канфлікт перайшоў у стадыю зацяжных перагавораў. Старшыня міністраў Бальдвін, што ў хуткім часе мае замер адбыць нараду з Пуанкарэ у справе нямецкіх даўгоў і адзначыў прыхільнае становішча Англii да Францыі і Бэльгіі.

Італія. Мусоліні зацьвердзіў праэкт уставы аб выбарнай рэформе абапёрты на сыстэме большасьці з застасаваньнем прапарцыянальнасьці да сьпіскаў меншасьцяў.

Партыя італьянскіх максымалістаў пастанавіла зарганізаваць „Тыдзень Сацыяльнай Прапаганды, з мэтай ажыўленьня сацыялістычнага руху ў Італіі, які ў значнай меры аслабеў, дзякуючы рэпрэсыям фашыстоўскага ўраду. Тыдзень распачынаецца 24 чэрвеня. У праграме прадбачаны шэраг маніфэстацый, якія-б пашырылі сацыялістычныя ўплывы на саюзы сандыкалістаў, арганізацыі моладзі і кабет. Праэктуецца зьбіраньне складак на выдавецкі фонд сацыялістычнай газэты „Avanti“ і на карысьць палітычных арыштаваных.

Замеры расейскіх манархістаў.

„New York Herold“ зварачывае ўвагу на пашырэньне дзейнасьці расейскіх манархістаў. Шмат дэлегатаў і прыхільнікаў канстытуцыйнай і абсалютнай манархіі прыбылі да Парыжа, дзе ўжо ў працягу некалькі тыдняў вядуць перагаворы, маючыя на мэце прызнаньне праз усе групы Мікалая Мікалаевіча за кіраўніка манархістычнага руху. Ген. Мілер, прадстаунік ген. Врангеля, заявіў, што афіцэры і жаўнеры б. арміі Врангеля згаджаюцца на тое, каб кіраўніцтва ўсім манархістычным рухам узяў на сябе Мікалай Мікалаевіч Маркаў, старшыня цантр. камітэту манархістаў, заявіў на апошнім сабраньні, што вялікі князь выбера адпаведны момант, каб распачаць дзеяльнасць, выбар жа кандыдата на трон будзе залежаць ад пазьнейшай пастановы.

У манархістычных колах цьвердзяць, што манархісты прызнаюць сучасныя граніцы Расеі з суседнімі дзяржавамі.

Польскія камуністы у Амэрыцы.

„Robotnik“ паведамляе, што орган польскіх камуністаў у Дэтройце „Głos Robotniczy“ у № ад 1-га траўня прызывае сваіх чытачоў да зьбіраньня ахвяр на чырвоны ваздушны флёт.

Барацьба за заробак у Францыі.

Забастоўка Саарскіх вуглякопаў скончылася. Частка прадпрыёмцаў згадзілася павялічыць заробак.

Забастоўка рабочых докаў у Нантэ скўнчылася поўнай пабедай рабочых.

У Эльбэфе забастоўка цягнецца. У горадзе адбылася аграмадная маніфэстацыя рабочых.

У Рурскай вобласьці.

Французы захапілі ў Рурскай вобласьці найвялікшыя фарбавальныя фабрыкі і канфіскавалі запасы хімічных прадуктаў, якія ацэніваюць у некалькі міліярдаў марак.

ПРАЦЭС БЕЛАРУСАЎ у БЕЛАСТОКУ.

(Ад уласнага карэспандэнта)

Пётра Саўчук.

Жых. в. Малочкі, Бельскага пав.

Зьмешчаны ў тых самых абодвых сьпісках, як і папарэднія абвінав., як „начальнік сэкцыі", мянюшка „Кучва" (?)

На пытаньні суду вінаватым сябе ня лічыць. Як дастаўся ў сьпіскі Скамароха ня ведае; да арганізацыі не належаў, бо службы ваеннай не знае. Мянюшку сваю першы раз пачуў на дапросе.

Антон Лукашук („Шабуленка").

На абодвых сьпісках Скамароха стаіць, як начальнік сэкцыі. Пры вобыску знойдзена кніжка камуністычных „Песен красного звонаря" з шыфраванымі запісамі. На пачатковым следзтве абв. Лукашук паказаў, (?) што ўвайшоў у арганізацыю па ўгавору Гр. Каляды, які казаў, што вясною будзе паўстаньне проціў Польшчы. Ен-жа пакінуў і кніжку вершаў з шыфрам.

На пытаньні суду заяўляе, што ў арганізацыі ўдзелу не прыймаў, мянюшкі сваей, ня ведаў, да дапросу з Калядою ніякай сувязі ня меў і ён ня ўгаворываў яго ўвайсьці ў арганізацыю. Выясьняе суду паходжаньне сваіх паказаньняў у судз. сьледаваццеля. Судзеб. сьледавацель, па словам абвінав. проста загадаў яму падпісаць гатовы пратакол паліцейскага дазнаньня, нават не прачытаўшы яго абвінавачанаму.

Пракурор. Ці абвінавач. вядома, што ў кніжцы быў шыфр.?

Лукашук. Не. Я ня настолькі пісьменны, дрэнна чытаю нават бяз шыфру.

Барташук Кузьма (Яварук).

Фігуруе на тых-жа дакумэнтах, як „начал. сэкцыі".

На пытаньні суду адказывае, што да арганізацыі не належаў; як папаў у сьпісак ня ведае.

Барташук Кірыла.

Быўшы матрос Бальт. флёту, жых. в. Грабоўцы.

Пяць разоў успамінаецца ў дакумэнтах Шыманюка, як „нач. району" з мянюшкай „Чайка". Жонка Шыманюка, Лізавэта, называе Бартушука бліжэйшым памоцнікам мужа—Скамароха. Пры вобыску знойдзены рэвальвэр сыст. Маузэр з 24 патронамі. Барташуку і Стасюку, па словам першага, Шыманюк, уцякаючы ў Мэрач, пасля таго як „kryjówka" была выкрыта загадаў закапаць у зямлю „канцэлярыю". Пасьля арышту Барташук і паказаў паліцыі, дзе была закопана „канцэлярыя Скамароха".

На пытаньне прадсядацеля прызнаецца, што належаў да арганізацыі

Прадс. Ці абвін. быў бліжэйшым памоцнікам Шыманюка?

Барт. Не. Бліжэйшых памоцнікам Шыманюка быў Андр. Тамашук. Шыманюк запісаў мяне ў „брацтва беларусаў".

Прадс. Што абвінавач. рабіў у арганізацыі?

Барт. Нічога ня рабіў

На далейшыя пытаньні адказывае, што ні аб якім паўстаньні Шыманюк яму не гаварыў, рэвальвэр прынёс запакованым у рожныя дакумэнты Шыманюк,—гэтак ён і знойдзены пры вобыску; усё гэтае Шыманюк прынёс перад самым вобыскам і арыштам.

З своей вёскі, апрача бліжэйшых пунктаў, нікуды ня езьдзіў.

Служыў у расейскім флёце, але ў дзейнасьці бальшавікоў-матросаў удзелу ня прымаў, бо ў пачатку 1918 г. вярнуўся на Бацькаўшчыну.

Язэп Бушка.

Зямлямер з Белавежы.

Фігуруе на двух сьпісках Шыманюка, як „начальнік району", мянюшка „Гарлоў". Вінаватым сябе ня прызнаў. Як папаў у сьпіскі ня ведае. Нікога з шайкі Скамароха ня знае. Папаў, хіба дзеля таго, што мае няшчасьце жыць у Белавежы каля пушчы.

Нічыпар Васілюк.

Жых. в. Чэхі, жалезнадарожнік.

Доказы ўспамінаюцца ў сьпіськах Шыманюка з мянушкай „Тошна".

Вінаватым сябе ня прызнае. Расказвае, як папаў у „арганізацыю" г. зн. у сьпіскі Шыманюка. Безработны жал.-дарожн. служачы, жадаў дзенебудзь паступіць на прывычную яму службу. Калі Шыманюк запрапанаваў яму службу, як каляёўцу, ён згодзіўся, хаця ня надта верыў Шыманюку, бо ён пры гэтым быў пьяны.

На прыкладзе Васілюка лепш за ўсё відаць, якія прыпадковыя, Богу душою вінаватыя людзі ўпісываліся Скамарохам у свае „сьпіскі партызанаў", каб атрымліваць грошы ад даверавючых „банкіраў" у Мэрачы і потым... даць матэр'ял пракурору для „акту абвінавачаньня".

Канец лірычнай прамовы няшчаснага забітага безработнага „каляёўца" падаём поўнасьцю. Ен просіць суд зрабіць тое, што абяцаў яму Шыманюк... прыняць яго на жал.-дар. службу. „Я малаграматны, я гэтых арганізацый ня разумею... Я цікавіўся паступіць на службу. Я заўсёды верай і праўдай служыў Бацькаўшчыне. Калі быў у Расеі, я верна служыў пры цару сваёй Бацькаўшчыне. Калі быў у Кіеве пры гэтмане, таксама колькі сілы было служыў сваёй ойчызне на жал.-дар. Цяпер так-сама хацеў служыць Польшчы, якая заўшэ была маей дрогой ойчызной"...

Апошнія словы выклікаюць усьмешкі на тварах судзей і абаронцаў. Ясна, што запраўдная Бацькаўшчына гэтага „жалез.-дарожн. грамадзяніна„—ягоная служба...

Кузьма Трафімюк.

Падафіцэр, жых. в. Грабоўшчына.

Зьмешчаны ў 2 сьпісках Шыманюка, як быўшы на пэнсыі ў арганізацыі для лучнасьці з мянюшкай „Кручкоў". Сьведка П. Краўчук паказаў, што Трафімюк быў у ліку тых, якім Шыманюк у пачатку красавіка ў памешканьні Масальскага ў Грабаўшчызне выплаціў пэнсыю. На пытаньні суду вінаватым сябе не прызнае, ў арганізацыі ня быў, грошай не атрымліваў.

Адам Трыпуз.

Вучыцель беларускай школы ў Горадні.

Правакатар Ленкевіч называе Трыпуза «начальнікам Горадзенскага пав.", а ў „надта сакрэтным" загадзе Хмары № 9 ад 31—1—1922 г. Трыпуз фігуруе, як „нач. штабу Горадзенскага аддз. пад мянюшкай „Каласкоў", пры гэтым прозьвішча перакручана: Трыбуз.

На пытаньне прадс. адказывае, што займаўся толькі вучыцельскім абавязкам, палітыкай не займаўся, ні да якіх партый і арганізацый не належаў. Як папаў у загад Хмары зусім ня ведае. З Ленкевічам ня меў нічога супольнага.

Абар. Врублеўскі. Ці ня ведае абвінав. аб размове, якую вела ягоная жонка з Андр. Калядой і ў якой гаварыла Калядзе, што ў Горадні жыве Баранаў, які стаіць на чале ўсей арганізацыі?

Трыпуз Ніякай гэткай размовы мая жонка ня мела і не магла мець,—гэта ўсё хлусьня. Таксама ня мог Каляда чуць маіх размоваў з жонкаю. Ні разу яго пры размовах з жонкаю ня было.

Жабінскі Сьцяпан.

Вучыцель, жых. вёскі Рудайкі.

Даныя акту абвінавачаньня.

У тайным загадзе Хмары № 9 фігуруе, як „начальнік штабу" Ваўкавыскага пав. пад мянюшкай „Пчала" з чым згаджаюцца і паказаньні Ленкевіча. Пры вобыску знойдзена: 1) рэвальвэр сыст. «Наган» Тульскай фабрыкі з 13 патронамі, 2) выданая ў Менску ў 1920 г. беларуская брашура „Стрэльба ў францускай пяхоце"; 3) пісьмы Веры Маслоўскай. У чэрвені 1922 г. падаў заяву судзеб. сьледавацелю на расейскай мове, пісаную бальшавіцкім (?) правапісам, выясняючы свой удзел у справе і ў канцы просячы аб дазволе на выезд у Савецкую Расею, аб чым прасіў яшчэ ў 1921 годзе.

На пытаньне прадс. аб вінаватасьці адказывае адмоўна

Прадс. Чым можа вытлумачыць, што прозьвішча абвінавачанага знаходзіцца ў тайным загадзе?..

Жабінскі. Магчыма, што гэта другі Жабінскі; я ніякім начальнікам штабу нідзе ня быў.

Прадс. Як папаў да абвінав. рэвальвэр?

Жабін. Рэвальвэр знойдзены ня ў мяне, а ў другім памешканьні і беспадстаўна прыпісаны мне.

Прадс. Якія стасункі ў абвінав. былі з Маслоўскай.

Жабінскі. Маслоўская запрапанавала мне паехаць на курсы ў Прагу. Я падрабязгова выясьняў усё гэтае судзеб. сьледавацелю, але той адказаў мне, што гэта яго не датыча і запісаў зусім другое, тое, што было ў акце паліцэйскага дазнаньня. Дзеля гэтага на сьледзтве запісана ўсё неправільна.

Прадс. Ці езьдзілі на зьезд у Прагу?

Жабін. Езьдзіў з Маслоўской; паехаў нелягальна, бо іначай ня пускалі.

Пракурор. Абвінав. даўно вярнуўся з Расеі і што рабіў у Расеі?

Жабін. У Расеі перш быў афіцэрам у царскія часы. Пасьля быў старшынёю бежанскага камітэту ў Пенза, дзе было шмат нашых беларусаў. У 1918 годзе 7 ліпеня вярнуўся на Бацькаўшчыну.

Прадс. Чаму абвінав. падаваў праз сьледавацеля заяву, каб вярнуцца ў Сав. Расею?

Жабін. Дзеля таго, што ад часу майго прыезду і прыходу палякаў, мяне заўсёды прасьледавала мяйсцовая адміністрацыя, без усялякага поваду з майго боку.

Прак. Чаму абвінавачаны карыстаўся бальшавіцкім правапісам.

Жабін. Гэты правапіс не бальшавіцкі, а Кэрэнскага.

Абар. Врублеўскі, азнаёміўшыся з заявай Жабінскага, тлумачыць суду, што ён паслугоўваецца правапісам, які ўведзены Тымчасовым Урадам па прапазыцыі Мін. Нар. Прасьветы Мануілава (к.-д.), які быў апрацованы яшчэ, пры цару Акадэміяй Навук. Бальшавіцкі правапіс рожніцца, хоць і ня надта моцна, ад гэтага.

Прак. У Прагу езьдзілі, як дэлегат?

Жабін. Не. Зацікавіўся ім прачытаўшы ў газэтах. Пасьля атрымаў запросіны з Вільні.

Прак. Ад каго?

Жабін. Ад Карабача

Абар. Врублеўскі. Скажэце Жабінскі,—Вы былі ў Празе на канфэрэнцыі, як ішла праца на канфэрэнцыі?

Жабін. Праца дзялілася па сэкцыям. Кожная сэкцыя працавала і прыймала рэзалюцыі пасобку.

Абар. Врублеўскі. Ці была прынята рэзалюцыя аб утварэньні Незалежнай Беларускай Рэспублікі—уселякімі мерамі—аж да аружнага паўстаньня ўключна?

Жабін. Не, гэткай рэзалюцыі ня было.

Абар. Врублеўскі. Але-ж абвінав. ведае: што Маслоўская кажа, быццам, падобная рэзалюцыя прынята палітычнай сэкцыяй?

Жабін. Магчыма, што яна мыляецца.

Абар. Врублеўскі. Ці быў на зьезьдзе Баранаў і ў якой сэкцыі ён працаваў?

Жабін. Быў і працаваў у сэкцыі дапамогі уцекачом і ахвярам вайны.

Абар. Врублеўскі. Ці былі на зьезьдзе Аляксюк і Дубяйкоўскі?

Жабінскі. Былі абодва.

Зьмітрук Стасюк.

Прозьвішча Стасюка і ягоная мянюшка „Салаўёў" фігуруе на 4 „listach płacy" знойдзеных у канцэлярыі Шыманюка, то як нач. району, то як памоцн. нач. аддзелу, ягонаю-ж мянюшкай падпісана запатрабаваньне, адрасаванае нач. 6 аддз. на абмундураваньне, як боты, адзежу, бялізну... Пры вобыску знойдзены рэвальвэр сыст. „гішпанскі браунінг".

На пытаньні прадс. адказывае, што да арганізацыі належаў, але знаў яе, як мірную а не вайсковую. У студзені 1922 г. прышоў Шыманюк і запрапанаваў увайсьці ў арганізацыю, але не гаварыў нічога аб паўстаньні. Я тады быў у надта дрэнным палажэньні, ён даў мне крыху грошай і я згадзіўся запісацца ў арганізацыю. Пасьля ён прыходзіў яшчэ раз, скардзіўся, што я не бываю ў яго і прадыктаваў мне „запатрабаваньне" на адзежу і назначыў начальнікам району, пад мянюшкай Салаўёў, але я нікуды ня езьдзіў, ніякай адзежы, ні ботаў не атрымліваў. На што Шыманюку патрэбна было, каб быў запісаны ў яго і для каго было гэтае „запатрабаваньне" гэтага я ня ведаю і ён гэтага не гаварыў.

Прадс. Абвінавачаны грошай ад Шыманюка больш не атрымліваў?

Стасюк. Першы раз ён даў мне 5.000 мар. польскіх, але, што я павінен быў рабіць, ён не казаў.

Пракурор. Значыцца абвінавачаны прызнаецца, што да арганізацыі належаў, але нічога ня ведаў аб яе мэтах і заданьнях?

Стасюк. Шыманюк казаў што пасьля расскажа, а пакуль што прасіў паказаць яму другіх людзей.

Пракурор. Адкуль у абвінав. рэвальвэр? Шыманюк даў?

Стасюк. Не, рэвальвэр я прывёз з Расеі.

Павал Шыманюк.

Брат Гэрмана Шыманюка—„Скамароха".

У „listach płacy" і другіх дакумэнтах Скамароха П. Шыманюк фігуруе ў характары „сэкрэтара"; у ведамасьці па разьездам так-сама ўспамінаецца прозьвішча П. Шыманюка.

На пытаньне аб вінаватасьці адказывае адмоўна. Хмары ня знае. Нікуды ня езьдзіў Грошай ні ад каго не атрымліваў. Жыў увесь час у сябе дома, працаваў на гаспадарцы.

Прак. Ці абвінав. ведаў, што брат яго стаяў на чале банды, зрабіўшай шэраг аружных нападаў?

П. Шыман. Не, ня ведаў. Даведаўся потым з абвестак у гміне. З братам у згодзе ня жыў. Я прыехаў у 1919, а брат у 1921 г. з Расеі. Нейкі час жылі разам і займаліся гаспадаркаю. „Але пасьля брату гэта надакучыла і ён выехаў ад нас. Ен ніколі ня гаварыў пра свае справы; кажучы: „ты—дурань, нічога не разумееш". Хто прыезджаў да яго ня ведаю.

Абар. Врублеўскі. Скажэце, Шыманюк, якая прафэсыя была вашага брата ў Расеі, да гэтай справы?

П. Шыман. Ен быў акторам.

Язэп Шыманюк.

Успамінаецца ў „сьпіску в Чэхі", знойдзеным сярод дакумэнтаў „канцэлярыі Скамароха". Абвін. Мацэевіч паказаў, што Язэп Шыманюк пасыўны сябра арганізацыі ў ролі кур'ера. На пытаньне прадс. вінаватым сябе не прызнае. Ні ў якай арганізацыі ня быў. Працаваў на жал. дарозе. Вызвалі на пастарунак і арыштавалі.

Андрэй Рошчэнка.

Сэкрэтар гміны ў Кляшчэлях.

Акт абвінавачаньня ня можа добра аддзяліць Андрэя Рошчэнкі ад ягонага брата Ігната, які, як здаецца, сапраўды быў сябрам банды Скамароха, але схаваўся. Лізавэта Шыманюк паказала, што А. Рошчэнка быў кур'ерам банды, езьдзіў пастаянна ў Мэрач за грашыма і інш. Тое-ж паказывае і Яўх. Іванюк, аб „якімсьці Рошчэнко“, што акт абвінавачаньня ўслужліва стасуе іменна да Андрэя Рошчэнкі, да того з двух братоў, які ня думаў хавацца і апынуўся ў руках улады. Таксама паказываў і абв. С. Мацэевіч. Аляксандра Назарук паказала, што насіла Рошчэнкам лісты ад сябраў банды, напр. ад „Хмеля“, які зрабіў некалькі забойстваў. Тое-ж паказывае і А. Нічапарук. Шыманюк пасылаў праз А. Назарука пісьмы да сямі Рошчэнкаў, з якіх адзін прыймаў удзел у нападзе на Кляшчэлі, а другі... быў сэкратаром гміны... Шыманюк, па словам Нічыпарука, казаў, што пісьмы можа аддаць абы каму з сямі Рошчэнкі, бо яны „ведаюць аб усім“.

На пытаньні суда аб удзеле ў арганізацыі і бандзе адказывае адмоўна. У Мэрач ня езьдзіў і ня мог ездзіць, дзеля таго, што заўсёды быў пры выпаўненьні сваіх службовых абавязкаў. Нікога з банды ня знаў. Пісем ні ад каго з іх не атрымліваў. Нічыпарука і Александры Назарук ня знаў і толькі цяпер першы раз убачыў на лаўцы падсудных.

На пытаньні абароны Назарук і Нічыпарук заяўляюць, што гэта—ня той Рошчэнка, што гэтага яны бачаць у першы раз.

Алексей Нічыпарук.

Мянюшка „Дуб“, жых. в. Вітава, Бельскага пав., 19 гадоў.

На пагляд — мае гадоў 14, бляды, змораны паўдзіцячы твар — робіць уражэньне паўідыёта. Адказываючы—плача. Гаворыць надта нявыразна. Абвінавачываецца у тым, што прыймаў удзел у беларускай паўстанчай арганізацыі і бандытызме. Па акту абвінавачаньня, згодна са словамі нейкага Карча і Яўх. Іванюка, гэты яўна недаразьвіты суб'ект, належаў да беларускай арганізацыі і разбойніцкай банды „выпаўняў абавязкі“ „szpiega wywiadowcy!!“ Удзел ягоны ў бандзе на дапросе падцьвердзіў і бацька А. Нічыпарука—Сьцяпан. Сьведка Цімох Хмель паказаў, што Нічыпарук намаўляў яго, але без посьпеху, ўступіць у беларускую армію, да якой належыць сам і ў якую Нічыпаруку удалося завэрбаваць Анісіма Захожага.

На пытаньні суду адказывае, што яго насільна запісалі ў арганізацыю Корч і Хмель, але не сказалі, што ён павінен рабіць. Далі раз 2000 марак і больш не давалі. Потым абодва — Корч і Хмель—завялі абвінав. ў пушчу і паказалі дарогу, а пасьля раніцой прывелі назад.

Прадс. Што-ж абвінав. рабіў у арганізацыі?

Нічыпарук. Корч сказаў прыходзіць у пушчу і выпаўняць ягоныя загады, але я нічога не рабіў.

Прадс. Колькі было сябраў у пушчы і як іх звалі.

Нічыпарук. 5 ці 6; як звалі ня ведаю. Мяне Корч зваў „Дуб“.

Анісім Захожы.

Як і Нічыпаруку акт абвінавачаньня закідае два абвінавачаньня: удзел у беларускай паўстанчай арганізацыі і ў разбойнічай бандзе Шыманюка. З Нічыпаруком выпаўняў рожныя даручэньні банды. З прычыны задуманага Шыманюком аграбленьня лесапілкі нейкага Крыскевіча ў Пагулянцы, даручыў Захожаму паступіць рабочым на гэтую лесапілку з мэтай разьведкі. Даручэньня Захожы не выпаўніў. Насіў пісьмы ад Шыманюка Сабасьцяну Смыку.

На пытаньне суду адкідае свой удзел у арганізацыі і бандзе. У пушчу пашоў з Нічыпаруком па загаду старшага брата Максіма, хоць быў хворы. Там пільнаваў коней. Пісьмо да Смыка атрымаў, але спаліў.

Прадс. Ці не даваў Шыманюк даручэньня паступіць на службу да Крыскевіча на лесапільню? ці не даваў грошай?

А. Захожы. Грошай даў 1000 мар., аб службе не гаварыў.

Пракурор. Ці паказваў на сьледзтве, што прыймаў удзел у арганізацыі і бандзе.

А. Захожы. Мяне так білі і так зьдзекаваліся на дапросе ў паліцыі, што я пасьля паказаў і падпісаў усё, што мне казалі.

Пры ўспаміне аб дапросе пачынае моцна плакаць.

Уладзімір Ваппа.

Лясьнік у Белавежскай пушчы.

Тыя-ж абвінавачаньні ў удзеле ў арганізацыі і бандзе. Па словам А. Нічыпарука быў разьведчыкам банды, інфармаваў яе аб падзеях, карміў галоўных бандытаў. Сярод дакумэнтаў Шыманюка знойдзена картка з напісам: „Ваппа — 5000 — на расходы—3155.

На пытаньне прадс. удзел свой у бандзе адкідае. Як папаў у сьпісак пастаўшчыкаў правізіі, ня ведае; ёсьць шмат аднафамільцаў—„іх цэлых 6 семьяў у нас, апрача нашай“, відавочна гэта адзін з іх.

Аляксандра Назарук.

Абвінавачываецца як у ўдзеле ў беларускай паўстанчай арганізацыі, так і ў бандзе. Была кур'ерам банды. Гэтую ролю падцьверджаюць А. Нічыпарук і В. Захожы. Аднак-жа абодва „памылкова“ завуць яе Аляксандрай Нічыпарук (муж Назарук — Нічыпар).

На пытаньні суду абодва абвінавачаньні адкідае. Кур'ерам банды ня была. Пісьмо да Рошчэнкі аднесла па просьбе Шыманюка, але не да гэтага Андрэя Рошчэнкі, а да другога. Што было ў пісьме ня ведае.

Пракорор. Абвінавачаная памятае, што ў судз. сьледаваццеля яна паказала, што адно пісьмо—першае—аддала іменна Андр. Рошчэнцы, а другое Ігнату.

А. Назарук. Не. Абодвы пісьмы аддала Ігнату, а гэтага ня знаю.

Прадс. пытаецца ў А. Нічыпарука і А. Захожага, ці гэтая кабета была кур'ерам банды.

Абодва адказываюць невыразна.

Абар. Грушкевіч. Скажэце, Нічыпарук, вы разумееце, што значыць слова „кур'ер“?

Нічыпарук лупае вачыма і адмоўна матае галавою.

Аляксей Стасюк.

Жыхар м. Кляшчэлі, шавец.

Абвінавачаньне цалком збудавана на вельмі ня хітрым апавяданьні пастарункавага Чапскага, які пераадзеўшыся ў цывільную адзежу і „прыкідаючыся інтэрнаваным расейцам (?), шукаючым працы“ вышаў на Кляшчэльскі рынак, і раптам адразу падыйшоў да яго сам нейкі чалавек, які аказаўся акурат тым, каго ён шукаў—Стасюком. Але і гэтага мала. Чапскі шукаў Ігната Рошчэнка, і вось Стасюк заявіў, што Чапскі яму надта спадабаўся і што ён пазнаёміць свайго новага прыяцеля з самым „атаманам Рошчэнкай“. Пэўна-ж, ня абышлося без адкравенных прызнаньняў аб арганізацыі і бандзе. Стасюк быццам нагаварываў Чапскага ўвайсьці і ў тую і ў другую, зрабіцца „Мининым и Пожарскім“ набраць і прывясьці ў пушчу аружжа, каб да жніва выгнаць палякоў за Буг. На другі дзень (відавочна выцьверазіўшыся) Стасюк зразумеў з кім меў справу і схаваўся. Тады Чапскі аб усім рэсказаў агенту Борсакову, які прыбыў у Кляшчэлі для розыску, і Стасюк быў арыштаваны. На дазнаньні ў Барсакова Стасюк аб усім прызнаўся.

У судзеб. сьледав. Стасюк паказаў, што Рошчэнка ўгаварываў яго паступіць у арганізацыю і ехаць з ім у пушчу, пасуліўшы пры гэтым 50.000 м. п.

Што датыча „нейкага чалавека, які пасьля аказаўся агентам паліцыі“, Стасюк паказаў, што ня ён, а гэты чалавек, гаварыў яму, што ён бандыт, паказываў рэвальвэр і угаварываў далучыцца да банды. Стасюк абвінавачываецца ў удзеле ў арганізацыі і бандзе.

На пытаньні суду Стасюк не прызнае сябе вінаватым. Рошчэнка ўгаворваў увайсьці ў арганізацыю, але ня ў банду, але бяз посьпеху.

Прадс. Ці ня ўмаўляў абвінавачаны „pewnego osobnika“ увайсьці ў арганізацыю, скардзячыся на уціск расейцаў у Польшчы?

Стасюк. Я быў пьяны, спаткаў яго на рынку, ён напаіў мяне яшчэ балей і угаворваў мяне паступіць у банду, кажучы, што ў ёй 20 аружных людзей, каб выгнаць, як „Минин и Пожарскій“ з Масквы, палякаў і з Горадзеншчыны...

Прадс. Ці абвінав. памятае, што ён паказаў на дапросе ў пшодовніка паліцыі і судзеб. сьледаваццеля.

Стасюк. На дапросе ў паліцыі быў наперад ababіты да паўсьмерці... З разьбітай да крыві галавою мяне дапрашывалі... Я не памятаю нічога, што я тады казаў... мусіць паказваў усё тое, што мне казалі..

Савасьцян Смык.

Жых. в. Добраводы Бельскага пав.

Два разы ўспамінаецца ў сьпісках паўстанцаў у Шыманюка ў „канцэлярыі“, як „начальн. сэкцыі“ з мянюшкай „Васількоў“ Апрача таго там-жа знойдзена „падпіска“ і «прысяга», падпісаная... Васільковым (а ня Смыкам!), ў якой апошні ў абліччы народу дае абавязак выпаўняць „усе ваенныя заданьні Бацькаўшчыны і Беларусі“... Пісьмо да Смыка ад Шыманюка насіў, быццам, Захожы, але спужаўся і не данёс, спаліў. Вось і ўсе улікі... На сьледстве Смык адкідаў свой удзел у арганізацыі, і прысягу пісаў ня ён. Экспэрт-каліграф ня прызнаў выстарчаючых даных для таго, каб прызнаць у падпісцы руку Смыка. На пытаньні суду вінаватым Смык сябе ня лічыць. Ні ў арганізацыі, ні ў бандзе ня быў.

Прадс. Ці абвінав. пісаў запіску с прысягай, падпісаную мянюшкай „Васількоў“?

Смык Ніякай мянюшкі ня ведаю. Прысягі ня даваў. Пасьля расказвае, што сам зьявіўся да ўладаў у 5 f. дэфэнзыву, а адтуль да сьледаваццеля і заявіў аб падазрэньнях і нагаворах процівў яго; сьледаваццель звольніў яго, а паліцыя зноў арыштавала.

Сымон. Мацэевіч.

Мянюшка „Жыдкоў“ і „Чорны“, жых. в. Чэхі, Бельскага пав.

Абвінавачываецца ў прыналежнасьці да беларускай паўстанчай арганізацыі і ўдзеле ў бандзе Шыманюка, з якой зрабіў шэраг аружных нападаў: 1) на склады дроў Вілейскай жал.-дар. Дырэкцыі, 2) на дом Чыжэўскага, 3) на м. Кляшчэлі і забойствах там і грабежствах. У часе вобыску знойдзена: рэвальвэр сыст. „Belholla“ з 7 патронамі і шэраг рэчаў, як паказаў сам Мацэевіч, Чыжэўскага. Удзел у бандзе падцьвердзілі Лізав. Шыманюк і Андрэй Тамашук (разстр.). У „крыюўцэ“ ў пушчы знойдзена недаканчанае пісьмо Мацэевіча.

На пытаньні суду адказывае, што напольску не разумее. Суд аб'ясьняецца з ім праз перакладчыка, альбо па расейску. Прызнаецца, што належаў да мірнай беларускай арганізацыі. Пад пагрозай рэвальвэрам Янка Захарчук прыняволіў яго ісьці ў пушчу.

Прадс. Ці прыймалі ўдзел у бандзе, падпаліваньні складаў дроў і другіх нападах?

Мацэевіч. Не Прыймалі ўдзел Шыманюк, Тамашук, Янка Захарчук, Чорт. У часе нападу на Кляшчэлі пагрозамі прыняволілі стаяць на варце і даваць сыгналы. Мяне ўмаўлялі Я. Захарчук і Андр. Тамашук увайсьці ў банду, але я не згадзіўся.

Прадс. Чаму абвінав. ў сьледаваццеля прызнаўся ў удзеле ў бандзе і ў шэрагу, нападаў а цяпер запіраецца ад таго, што паказаў у сьледаваццеля?

Мацэевіч. Мяне так моцна білі на дапросах у паліцыі, я ня знаю, што сьледавацель напісаў,—па польску не разумею. Ен загадаў падпісаць пратакол—я падпісаў.

Прадс. Чаму абвін. так падробна паказываў на сьледзтве, хто і дзе прымаў удзел, а цяпер маўчыць?

Мацэевіч. Дзеля таго, што мне яны самі гаварылі, падказывалі, я не спрачаўся—яны і запісывалі... яны білі мяне.

Прадс. Але-ж судзеб. сьледав. абвінав. ня біў?

Мацэевіч Я сьледаваццеля ня знаю. Ен нічога ня пытаўся. Сказаў падпісаць—я падпісаў. Баяўся, што зноў будуць біць.

Прадс. Адкуль у абвінав. гадзіньнік, які ўзялі пры вобыску?

Мацэев. Гадзіньнік, рэвальвэр і др. рэчы мне даў Шыманюк, даў яшче 15,000, каб купіць хлеба і сказаў ісьці на разьведку. Я пашоў і больш да іх у пушчу ня прышоў.

Прадс. Ці ведае абвінав., што ў Кляшчэлях пры нападзе забіта 2 паліцэйскіх?

Мацэевіч. Чуў потым.

Прадс. Ці ведае абвінав., што шэраг іншых нападаў банды так-сама злучаны з забойствамі і грабежствамі.

Мацэевіч. Я чуў потым, але сам браў удзел толькі ў палітычнай дзейнасьці арганізацыі.

Прадс. А скажэце, забойства паліцэйскіх у Кляшчэлях гэта так-сама палітыка?

Мацэевіч. (Аўтаматычна паўтарае) Але, гэта так сама палітыка (*парушэньне*).

Яфрэм Іванюк.

Жых. в. Лазова, Бельскага пав.

Абвінавачываецца ў прыналежнасьці да паўстанчай арганізацыі і банды Шыманюка. У апошняй зрабіў шэраг нападаў з забойствамі і грабежствамі, у тым ліку і забойства ў пушчы дзяцей Алькевіча. На дапросе ў сьледаваццеля прызнаўся толькі ў нападзе на дом лясьнічага Алькевіча. У сьпісках Шыманюка фігуруе, як „нач. сэкцыі“ з мянюшкай „Лес“.

На пытаньні суду вінаватым сябе не прызнае. Пад пагрозаю сьмерці прыняволілі ісьці разам на дом Алькевіча, але дзейнага ўдзелу ў нападзе не прымаў. Аб забойстве дзяцей Алькевіча чуў потым, але сам пры гэтым прысутным ня быў. У беларускую арганізацыю заманіў абвінавачанага ў пачатку 1922 г., пасьля таго як ён вярнуўся з Расеі, адзін чалавек. „Ен сказаў, што гэта мірная арганізацыя, што на чале яе стаіць Шыманюк.. Ен мяне запісаў і тым справа скончылася. Я ўвесь час жыў дома. Але пасьля прышлі да мяне і загадалі ісьці да атамана Скамароха, які сказаў, што пойдзе да Алькевіча, які зьяўляецца польскім шпіонам. У паліцыі мяне паказвалі Алькевічу. Ен назваў Тамашука і іншых, а мяне—не, і запытаўся: „а гэта—хто?“

Прадс. Ці абвінав. атрымліваў грошы ад Шыманюка?

Іванюк. Не.

Прадс. А ў сьпісках партызанаў Шыманюка паказана, што абвінав. атрымліваў пэнсыю.

Іванюк. Не, не атрымліваў.

Мікалай Вольф.

Абвінавачываецца ў дзейным удзеле ў абодвых арганізацыях і ў тым, што ў складзе банды зрабіў шэраг разбойных нападаў. Удзел у нападзе на дом Чыжэўскага падцьверджаюць паказаньні сьведкаў: бацькі Мікалая Вольфа Янкі, абвін. Мацэевіча, Ал. Нічыпарука, растрэлянага главара банды Нецелюка і Нічыпарука Панцялея.

На пытаньні суду вінаватым сябе ня лічыць. Ні да арганізацыі, ні да банды не належыў. Прадуктаў у Пушчу не вазіў. Нікога з банды ня знаў.

Прад. Абвінав. Мацаевіч, вы паказывалі, што Вольф вазіў у Пушчу прадукты, прымаў удзел у нападзе на Чыжэўскага?

Мацэевіч. Гэта—хлусьня. Я нічога не гаварыў, паліцыя казала а я паўтараў, дзеля таго, што гэтак прыказвалі. А сьледаваццель нават ня

запытаўся нічога ў мяне — проста даў падпісаць гатовы пратакол.

Хведар Крот.

Крамнік з в. Верстак, каля Пушчы.

Абвіначываецца ў удзеле ў беларускай арганізацыі, маючай на мэце аружнае паўстаньне і ў бандзе Шыманюка, для якой зьяўляўся паставўшчыком правіянту. У сьпіску паўстанцаў Шыманюка, знойдзенага у „канцэлярыі“ значыцца, што атрымаў 50,000 за прадукты. Шэраг сьведкаў, як бацька Андрэя Тамашука — Тарас, Лізавета Шыманюк, С. Мацэевіч, далі паказаньні, сьцьверджаючыя яго прыналежнасьць да банды. На пытаньні суду Крот вінаватым сябе ня лічыць.

Прэдс. У дакумэнтах Шыманюка знойдзены рахунак за прадукты на 50,000 м. для банды, дзе стаіць прозьвішча абвінач. Ці абвін. даставіў гэтыя прадукты?

Крот. Рахунак пісаны і падпісаны праз мяне?

Прад. Не, невядома кім. Падпісу няма.

Крот. Не магу адказваць на гэта.

Далей абвінав. кажа аб тым, што ён ня мог належаць да ніякай арганізацыі, ні банды. Ен інвалід, бяз рукі, сяк-так гандлюе ў крамцы і зарабляе на кусок хлеба. У крамку прыходзяць рожныя людзі, і я ня пытаюся, хто ў мяне купляе—прадаю ўсім.

Крот. Прашу задаць пытаньне. Дзе запісана, што я паказаў, быццам да мяне заходзілі аружныя людзі і вымагалі правізію: у следаваццеля, ці ў пратаколе дэфэнзывы?

Прад. у сьледаваццеля.

Крот. Гэта няпраўда. Я казаў гэта ў дэфэнзыве, дзе мяне 4 разы вадзілі з пакою для допросу ў цёмную каморку, ў якой білі і пыталі. А сьледаваццель нават ні аб чым мяне і ня пытаў і даў падпісаць пратакол дэфэнзывы.

Пракурор. Ці вазіў абвінав. ў Сталпацішкі Шыманюка?

Крот. расказвае, як ён вазіў невядомага яму мушчыну, які пагражаў яму рэвальвэрам.

Пракурор. Ці гаварыў абвін. бацьку А. Тамашука Тарасу, які прышоў да яго даведацца аб сыну, што Тамашук можа быць спакойным за сына—галодным у пушчы ня будзе: адвёз ім провіянту на 30 000 мк?

Крот. Гэта—няпраўда. Я спаткаў Тараса Тамашука ў цэркві і на пытаньне яго, як ідзе гандаль, адказаў, што нічога,—ўчора ўтаргаваў 30 000 м.

Другі дзень закончыўся. Усе абвінавачаныя дапрошаны. Трэба адзначыць, што бадай усе абвінав. *на пытаньні прадседацеля, альбо пракурора*, чаму іхнія паказаньні на судзе, у сьледаваццеля і ў паліцыі так расходзяцца, бадаў, усе заяўлялі, што іх у паліцыі на дапросе білі, зьдекаваліся, некаторыя падробна апісывалі прылады пытак, якія ўжываліся ў Дзяржаўнай Паліцыі. Усе гэтыя заявы аб нячуваных зьдзеках і нарушэньнях грамадзкіх правоў, гарантаваных Канстытуцыяй Польскай Рэспублікі. выслухоўваліся, як штосьці звычайнае. Ні адзін з абаронцаў нават не зрабіў суду аб гэтым заявы... не папрасіў нават запісаць у пратакол аб гэтых заявах абвінавачаных. Відаць да ўсяго гэтага мы ўсе прывыклі пры царскіх парадках... прывыкаем і пры рэспубліканскіх...

Але ня лепш. згодна з масавымі скаргамі, выпаўніў свой судовы абавязак перад судам і сваім сумленьнем і прадстаўнік сьледзтва—следаваццель Ясінскі. Памімаволі ўспамінаецца, здаваўшыся не падобным да праўды. судз. сьледав. па асабліва важным справам у вядомым працэсе Дашнакцутюн (грузінскіх с.-д. партыя) Лужын, якога улічылі ў цэлым шэрагу падлогаў і... які атрымаў зараз-жа пасьля працэсу павышэньне...

Судз. сьледаваццель Ясінскі як заяўляюць, бадай, усе абвінавачаныя, бадай, зусім звольніў сябе ад няўдзячнай працы дапрашываць нанова абвінавачаных,—калі ўжо былі гатовыя вельмі добра, сьцісла, згодна і літэратурна ўложаныя акты дазнаньняў у паліцыі. Адваму на ягоны адмоўны адказ прыкрыкнуў „milcz, psia krew!“... Ясна, што судз. сьледаваццель выклікаў да сябе падсьледзтвеных не дзеля таго, каб яны гаварылі.. але каб толькі падпісвалі...

Дзеля паўнаты роўналегласьці... з Лужыным застаецца толькі пану Ясінскаму атрымаць павышэньне..

(Працяг будзе)

З газэтных вестак.

З прыходам сёлятніх цёплых веснавых дзён пачалі прасыпацца чорныя монархічныя расейскія эмігранты, якія паўцякалі заграніцу ў часе расейскай рэвалюцыі. Адбываюцца зьезды, нарады; рыхтуюцца наладзіць адзін фронт, каб пры дапомозе спагадаючых ім эўрапейскіх дзяржаваў, якія ахвотна далі ім у сябе гасьціннасьць і падтрыманьне, скінуць Савецкую ўладу ў Расеі і захапіць самім ўладу, ў свае «практычныя» рукі. І зноў выплываюць на сцэну ген. Міллер, Купецаў, Шацілаў. Урангель, якія сьпяшаюцца ў Парыж спатыкаць былога вялікага князя Мікалая Мікалаевіча, мчыцца туды-ж ген. Юдэніч з Рэвеля, з Будапэшту ген. Дэвікін, Гурка і др.; раней ўсяго, вядома, зьявіліся тулы дэлегаты ад расейскіх чорных гнёздаў ў Сэрбіі, Турцыі, у Польшчы. Не абыйшлося і без „вялікага князя“ Кірылы Уладзіміравіча, які робіць заяву аб сваім падпадпарадкаваньні „старэйшаму ў Доме Раманавых“ Мікалаю Мікалаевічу. Зьбіраюцца выпусьціць нават свой „маніфэст“ да „русскаго народа“.

Няўжо-ж гэтыя «жывыя трупы» яшчэ маняцца прабаваць шчасьця? Няўжо спадзяюцца яны, што за імі пойдзе народ, што ён аддасьць уладу з сваіх рук, што ён згодзіцца аддаць тую зямлю, якой карыстаецца сялянін яшчэ з часоў рэвалюцыі? Не, песенька гэных „сіяцельных“ скончана, аднаўленьне старога аджыўшага ладу выключана абсалютна. Новае жыцьцё творыцца толькі новымі людзьмі, выстаўленымі самым народам, а „сіяцельныя“ няхай заспакояцца.. мэмуарамі.

* * *

Беларускія кругі не забыліся яшчэ аб чорнай працы ў Горадні так званых „беларускіх актывістых“ на чале з панам Міткевічам, які свайго часу перад выбарамі у Варшаўскі Сойм выдаваў у Горадні польскую газэтку ў беларускай мове Добра помняць беларусы гэнага пана ў часе самых выбараў, калі ён і і блізкія да яго агітавалі проці № 16. Але наш народ ужо добра разьбіраецца на гіллях, і улюблёны Міткевічам № 22 праваліўся разам з ім, яго духоўным „бацькам“ Балаховічам, Дзяргачом і інш. Не так-то, як відаць цяпер, лёгка ашукаць „просты“ народ наш: навучыўся наш селянін адрожніваць „прыяцеляў на час“ ад запраўдных абаронцаў яго інтарэсаў, не паверыў ён фарбаваным лісам Міткевічскага гатунку. І добра зрабіў. Бо паглядзіце, што далей сталася. У палавіне мая пачала выходзіць ў Горадні польская газэта на расейскай мове „На рубежѣ“, якая па напрамку сваім і па стылю ды мусіць і па грашовых крыніцах зьяўляецца насьледніцай ранейшай Міткевічаўскай газэткі ў беларускай мове. Шыбка-ж мяняе «дабрадзей» Міткевіч нацыянальную сваю вопратьу. «Скінуў скурку» ўрэшці, схаваўшыся да часу за плечы нейкага новага рэдактара-выдаўця Р. Kraczkiewicza. Ці не дадзены толькі яму прыказ рыхтавацца да новых выбараў?!

Александровіч.

Ангельскі друк аб адносінах між Расеяй і Англіяй.

Адносна спрэчак у ангельскім парлямэнце па прычыне ноты Керзона газета „Манчэстэр Гардыан“ піша, што спрэчкі пацьверджаюць падазрэньне, што ультыматум Керзона прадыктован жаданьнем зьнішчыць урад. Адхіленьне расейскага адказу Мак Нэйлем азначае, што ангельскі ўрад хоча сваркі. Расейскі адказ даваў усе мажлівасьці маўчліва ўзяць назад ультыматум, але ультыматум застаецца, хаця працягнен яго тэрмін. Па думцы газэты, разрыў няўхілен.

„Дэйлі Кронікль“, орган Лёйд Джорджа. піша, што Савецкая нота сьведчыць аб прымірыцельным настроі, на які Керзону трэба адказаць тым жа самым. Разрыў зносін з Расеяй ня меў бы ніякіх апраўданьняў. Савецкая нота права, тлумачачы большую частку канфлікта адмаўленьнем некаторых дзяржаў адносіцца да Савецкага ўраду, як роўны да роўнага. «Мы не перасталі заяўляць,—піша газэта,—што пачаткам разумнай палітыкі на Усходзе зьявілася б прызнаньне Савецкага ураду».

„Дэйлі Ньюс“, піша: „Кэрзон дабіўся вызваленьня брытанскіх тральшчыкаў і ўмоўнага прапанаваньня кампэнсацыі аддзельным асобам, узяцьця назад лістоў Вайнштэйна і прапанаваньня канфэрэнцыі.

Голас з вескі.

Часта мы чуем гутаркі аб свабодзе. Кажуць, што ёсьць недзе, ў кагосьце дужа добрая канстытуцыя, што за Бугам пражывае свабода, але да нас ня можа перайсьці, бо быццам Буг дужа глыбокі і шырокі.

А прыехаўшыя з Польшчы да нас чыноўнікі кажуць, што яны гэта і ёсьць сама свабода. Калі гэта праўда, і мы лепшай свабоды не пабачым дык неміласэрдна нас судзьбіна пакарала, бо душа наша з голаду паміраэ і ў скуру доставецца, акурат як паншчына, аб якой гутараць нашыя дзяды. Білі нас царскія слугі за тое, што мы „палякі“, а цяпер б'юць некатарыя панскія папіхачы за тое што мы „маскалі“ і бальшавікі. Над тым, што разскажу далей, хай кожны сялянін падумае, хай кожны, хто трымае ўладу хоць на мамэнт станіць сам сабой, адкіне „przepisy“, астанецца з сваім сумленьнем ды хай падумае і разважыць ці-ж можна так зьдзекавацца над чалавекам, ці можна апраўдываць такія учынкі і караць пакрыўджанага за яго крык а помачы.

Было гэта летам, яшчэ ў прошлым годзе, у вёсцы Катлы, Бельскага пав. Кіраўнік стан. Бельск купіў у нашых сялян луг. Трава была скошана і сена зложана ў тры стагі. Зімой, калі топкае балота замерзла, солтыс нашай вёскі атрымаў загад, каб мы адвязьлі гэта сена ў Бельск. Такіх загадаў у нас хапае вкоптарам. Загадываюць ехаць за 40 верст па мэтар для лясного падрадчыка —едзем. Падрадчык праўда заплаціў... а колькі—э, ды Бог з ім... Мы прывыклі да ўсяго і цяпер бы павязьлі, каб толькі ня тое, што была страшная галалёдзіца, а коні некаваныя.

Праз два дні прылетае ў нашу вёску якісь чын, як нам пасьля тлумачылі „gospodarz powiatu“ і вось ён у нас «пагаспадарыў» адзін дзень. але мы будзем памятаць яго цэлыя вякі. Узяўшы ў адну руку равольвар, а ў другую гарапнік гэты чын пашоў абходзіць вёску, выганяючы сялян ехаць па сена, пры гэтым лаянкай польскай і расейскай хацеў прыдаць больш строгасьці сваім прынуківаньням. Сяляне сталі адпрашывацца, каб адлажыць на якісь час перавозку сена, бо коні ня змогуць вясьці па лёдзе; тады чын пачаў біць гарапнікам і пагражаць растрэлам першаму папаўшаму. Якрас у гэты час прыехаў з Расеі адзін інтэлігентны жыхар нашай вёскі, які ехаў у Польшчу, глыбока веручы ў яе шчыры дэмакратызм. Пабачыўшы біцьцё безбаронных людзей, выказаў сваё здзіўленьне і пратэст, за што ад чына атрымаў шэсьць удараў гарапнікам

Асабліва моцна пакрыўджаныя два калекі (храмыя) пашлі з жалабай да старроства ў Бельск, але там іх да старасты не дапусьцілі, а дробязь чыноўніча пажартавала, выкпіла іх і бедакі вярнуліся ні з чым.

А то вучыцелька польскай школы загадала зрабіць ссыпку на школу. Справа была вясной—сяўба, шмат у каго з сяла няма насеньня, дык як жа зрабіць ссыпку. Ноччу налетае на нашу вёску паліцыя і бяруць збожжа ў тых, хто даў і хто ня даў ды не па 25 ф. як належыла, але сколькі хацелі. У прыдачу некатарых пабілі.

Нядаўна быў такі выпадак... Але хай лепш гэты выпадак адойдзе крыху ў даўнасьць... Хай час прытупіць боль. Думаеце, лёгка мне усё гэтае казаць. Мы ўжо не раз пасылалі жалабу за Буг, да свабоды, але нешта ніякіх пачутак няма—ма быць ня можа дайсьці, бо кажуць, што Буг вельмі глыбокі і шырокі.

Р. Юр.

Карэспандэнцыі.

М. Трабы Валожынскага пав.

25 траўня паліцыянт Квасьнеўскі, пачуўшы звадку гаспадара з гаспадыняй у доме сяляніна Юлюковіча, прышоў у хату і нібы ў абароне гаспадыні зьбіў Юлюковіча да крыві, а пасьля засадзіў яго ў адседку дзе ён і цяпер сядзіць.

Як кажуць паліцыянт Квасьнеўскі быў дужа сярдзіты на Юлюковіча і ўсё чакаў выпадка, каб яму адамсьціць.

Пак.

Веска Грыневічы, Вялейскага пав.

22 траўня г. г., калі наша вёска выгнала сваю жывёлу на пашу свайго сэрвітуту, дык пабачыла, што на жывёлу зьвярнуўшы з гасьцінца, ішло ў баявым парадку конніца ў польскай форме, пры поўным узбраеньні, з паднятымі голымі шаблямі. Двох афіцэраў наўзаводы ехала на перадзі.

Акружыўшы з усіх бакоў скаціну і нашых пастухоў гэтае войска пачало бой. Ведама, што пабеда аказалася з боку войска, супраціўнік яго налічае такія страты: штук дзесяць параненых кароў і пабітыя да крыві пастухі. Але гэтаму не канец. Вяскоўцы, даведаўшыся аб бядзе, кінуліся ратаваць сваіх кароў, каб зрабіць ім перавязкі і лекарскую запамогу, але за гэтую сьмеласьць былі атакованы войскам і з ахвярамі адагнаны ў вёску. Раненымі аказаліся: Капярына Станкевіч, Марцэля Капыш, Язэп Станкевіч, Янка Войцік, Юстына Вярэнка, Францішак Вараны, Язэп Стадальнік, Ганна Стадальнік, Францішак Юргевіч, Язэп Войцік, Пятрук Варэнка.

Як посьле выясьнілась, дык напаўшае войска было II швадрон 4 палка Занеманскіх уланаў пад камандай ротмістра Гецэвіча, паручніка і ўпраўляючага маёнткам Парахвіянава панам Астравецкім.

Усё гэта запісана ў пратакол і сьверджана гмінай і мясцовым фэльшарам.

Віноўнікі пацягнуты ў суд пацярпеўшымі.

Пакрыўджаны.

З беларускага жыцьця

— У Менску вышаў № 1 „Маладыя Аратар“ часопісь Беларускай Камуністычнай Моладзі. Часопісь друкуецца па беларуску.

— Беларускае Грамадзянскае Сабраньне у Вільні пераехала з Біскупскай вуліцы № 12 на Віленскую 33, дзе мяркуе прывясьці ў парадак быўшую бібліатэку „Знаніе“ і адкрыць для карыстаньне публікі.

Новая беларуская часопіс.

5-га траўня ў Вільні вышаў № 1 „Наш Сьцяг“ под рэдакцыяй Я. Лагіновіча. Газэта выходзіць тры разы ў тыдзень.

Беларусы! Трымайцеся грамады—лягчэй будзе даць адпор наступу капітала.

Выпісывайце і распаўсюджывайце сваю газэту. Асьведамляйце несьвядомых.

Прысылайце рэгулярна падпіскі і даплаты. Падтрымлівайце ахвярамі.

Пішыце аб жыцьці-быцьці весак, аб сваіх ворагах і прыяцелях.

Рэдактар-выдавец В. Прохараў.

Друкарня А. Дворжэца, Завальная 32.